**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Гомій» дзяржаўнай ўстановы «Гарадскі цэнтр культуры г. Гомель»**

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Гомій» быў створаны ў 1982 годзе на базе Палаца культуры вытворчага аб’яднання «Гомельпрамбуд». У 1986 годзе атрымаў найменне «народны самадзейны калектыў мастацкай творчасці». У 2002 годзе – званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

У складзе калектыву дзве групы – харэаграфічная і вакальная. Агульная колькасць удзельнікаў канцэртнага складу – 25 чалавек, узрост – ад 15 да 40 гадоў.

Мастацкім кіраўніком і балетмайстрам калектыву з першага дня стварэння з’яўляецца Свярдлоў Пётр Іванавіч, заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1991 год). Як кіраўнік ансамбля «Гомій» Пётр Свярдлоў за плённую працу ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Гомельскіх абласнога і гарадскога выканаўчых камітэтаў і Саветаў дэпутатаў, нагрудным знакам «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Ганаровым знакам Беларускага прафсаюза работнікаў культуры. За высокія дасягненні, творчы падыход у прафесійнай і грамадскай дзейнасці ў 2009 годзе яму прысвоена найменне «Чалавек года» ў намінацыі «Майстар».

Балетмайстар – Гулевіч Сняжана Аляксандраўна (з’яўляецца ўдзельнікам ансамбля «Гомій»). Хормайстар – Беразоўская Людміла Віктараўна.

Пётр Свярдлоў беражліва адносіцца да беларускага фальклору і ў той жа час смела трансфармуе яго па законах сцэнічнай драматургіі. Гэта і вызначыла творчыя накірункі ансамбля: адраджэнне і ўвасабленне песеннага і танцавальнага фальклору Беларусі, захаванне і развіццё традыцыйнага харэаграфічнага мастацтва, інтэграцыя беларускай нацыянальнай культуры ў міжнародную культурную прастору.

У аснове рэпертуару ансамбля – вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі, якія адрозніваюцца па тэматыцы, ступені складанасці,

своеасаблівыя і цікавыя ў творчым вырашэнні. Кожны танец, музыка, песня ў выкананні калектыву нясуць у сабе адбітак народнай традыцыі.

Адна з адметных работ Пятра Свярдлова – «Полька на зэдліках» стала правобразам пастаноўкі ў прафесійным калектыве – Дзяржаўным ансамблі танца Рэспублікі Беларусь.

Сёння ў ансамблі налічваецца больш за 30 разнастайных вакальных і вакальна-харэаграфічных пастановак.

Ансамбль «Гомій» мае дзіцячы калектыў-спадарожнік – узорны калектыў народнага танца «Золак» дзіцячай харэаграфічнай школы мастацтваў г. Гомеля. Пасля заканчэння школы ўдзельнікі калектыву «Золак» пераходзяць у ансамбль «Гомій», дзе працягваюць удасканальваць сваё харэаграфічнае майстэрства. Некалькі ўдзельнікаў ансамбля – выпускнікі Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў – цяпер працуюць педагогамі ў Гомельскай дзіцячай харэаграфічнай школе мастацтваў.

Выкарыстоўваючы ўвесь арсенал атрыманых ведаў і навыкаў, удзельнікі калектыву «Гомій» імкнуцца стварыць свой непаўторны стыль, сцэнічнае ўвасабленне задум кіраўніка ансамбля.

Для ўдзельнікаў ансамбля характэрны добрая вакальная і харэаграфічная падрыхтоўка, высокая выканаўчая культура, артыстызм. Пастаноўкі ансамбля «Гомій» маюць найвышэйшы эстэтычны і маральна-патрыятычны ўзровень, што дазваляе яму прымаць дастойны ўдзел у абласных і гарадскіх святочных канцэртах, якія прысвечаны такім святам, як Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дзень абаронцы Айчыны і Ўзброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, Дзень горада і інш.

Калектыў адным з першых адгукнуўся на трагічныя падзеі 1986 года ў Чарнобылі. Яго ўдзельнікі выступалі з канцэртамі перад жыхарамі раёнаў, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, і ліквідатарамі наступстваў аварыі.

За 36 гадоў свайго існавання ансамбль «Гомій» пабываў з канцэртнымі праграмамі ва ўсіх абласцях Рэспублікі Беларусь. Акрамя таго, неаднаразова знаёміў з беларускім народным мастацтвам гледачоў шматлікіх краін: Украіны, Расіі, Францыі (1987 г.); Нарвегіі (1988 г.), Бельгіі (1990 г.), Балгарыі (1990, 2002, 2006 гг.), Зімбабвэ (1992 г.), Шатландыі (альтэрнатыўныя фестывалі 1991, 1993 гг.), Германіі (з 1993

па 2001 гг.), Даніі (1996 г.), Англіі (канцэртнае турнэ, 1999 г.), Латвіі (2007, 2016 гг.). У розныя гады ансамбль прымаў удзел у тэлеперадачах, а таксама ў розных фестывалях і конкурсах розных узроўняў.

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь вакальна-харэаграфічны ансамбль «Гомій» – перспектыўны, творчы і працаздольны, мае сваё творчае аблічча, не спыняецца на дасягнутым, пастаянна імкнецца да пошуку новага ў інтэрпрэтацыі фальклорнага матэрыялу і далучэння да яго моладзі.





